Ведай нашых!

«ВЕРА Ў БОГА, ЛЮБОЎ ДА ЛЮДЗЕЙ — ВОСЬ І ЎВЕСЬ САКРЭТ ДАЎГАЛЕЦЦЯ»

...У свеце многа вёсак, пра якія людзі нават не чулі. Але ж часам менавіта ў іх нараджаюцца і жывуць сапраўдныя героі. Мне з такім пашчасціла пазнаёміцца.

Іван Ігнатавіч КОМАР — чацвёрты злева, брат Максім — першы злева, 2014 год.

Упершыню Івана Ігнатавіча Камара я ўбачыла ў 2014 годзе, калі ён, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, на святкаванні дня Перамогі павязваў піянерскія гальштукі, у тым ліку і майму брату. А праз некалькі гадоў — ужо мне.

Мы, валанцёры, не раз наведвалі Івана Ігнатавіча дома, і я бачыла, што чалавек гэты моцны духам і ў той жа час вельмі добры. Ён заўсёды з радасцю сустракаў гасцей, з задавальненнем расказваў пра сваё жыццё, паказваў школьныя сшыткі і розныя фотаздымкі, здзіўляў нас валоданнем камп'ютарам і тым, што побач з Іванам Ігнатавічам, мусіць, любы з нас адчуваў сябе досыць значным чалавекам, бо ветэран казаў, што кожнае дзіця — каштоўнасць свету. Не верыць яму нам не выпадала, хоць бы таму, што нарадзіўся Іван Ігнатавіч сто гадоў таму 1 ліпеня.

Сям'я ў яго была самая звычайная, як і большасць іншых. Спачатку хлопчык скончыў толькі чатыры класы сельскай школы і пайшоў вучыцца на краўца ў суседнюю вёску Ракевічы. Магчымасць вярнуцца ў школу, праўда, ужо ў польскую, у яго з'явілася пазней. У ветэрана з часоў той вучобы захаваліся фотаздымкі, а таксама яго сшыткі і дзённік. У іх — адны пяцёркі (найвышэйшыя тады адзнакі!). А які цудоўны почырк!

...Да пачатку вайны Іван Ігнатавіч паспеў папрацаваць краўцом. Казаў, што яго першай спробай былі мужчынскія порткі. Больш складаныя рэчы, нават жаночыя сукенкі, кравец навучыўся прыдумваць і шыць пазней. Аднак кар'еру ў гэтай справе зрабіць не паспеў. Грымнула вайна, і ён стаў маладым радавым, які ваяваў на ўкраінскай зямлі, потым — на венгерскай. У 1945-м Івана Ігнатавіча параніла, асколак трапіў у калена, і пранасіў яго ветэран аж да 2009 года. «Бог ахоўваў мяне!» — кажа ён.

...Сваю будучую жонку Іван Ігнатавіч сустрэў пасля вайны, у любові і вернасці пражыў з ёй амаль паўстагоддзя. Потым Вольга памерла. Дзяцей, на жаль, не было, а вось спраў ды клопатаў — ва ўсе поры года і хоць адбаўляй: агарод, гаспадарка, шыццё... Іван Ігнатавіч заўсёды чым мог дапамагаў аднавяскоўцам, меў любімыя захапленні.

З дзяцінства, напрыклад, ён марыў навучыцца фатаграфаваць і пасля вайны стаў гэтым займацца — здымаць на плёнку свае родныя мясціны, сваіх аднавяскоўцаў.

Адначасова з гэтым ён вёў летапіс роднага Нянькава — пісаў пра ўсё, што ў вёсцы адбывалася: хто калі пераехаў, хто з'ехаў, хто тут нарадзіўся, чым займаўся і чым вылучаўся... Такім чынам, дзякуючы Івану Ігнатавічу захаваліся дакументальныя звесткі аб тым, як праходзіла жыццё ў гэтай мясцовасці. Праўда, з гадамі нейкіх адметных падзей тут станавілася ўсё менш і менш, бо старыя людзі паміралі, а маладыя з'язджалі ў гарады.

На здымках і ў летапісе Івана Ігнатавіча згадваецца, напрыклад, царква святых апосталаў Пятра і Паўла, якая некалі стаяла ў Нянькаве.

Адлюстраваны там і часы багаборніцтва, калі царквы не стала...

А сам Іван Ігнатавіч у Бога верыў і пранёс гэтую веру праз усё жыццё. У сям'і ягоных бацькоў і ў яго ўласнай заўсёды выконваліся царкоўныя звычаі, адзначаліся рэлігійныя святы.

«Вера ў Бога, у людзей і любоў да іх — вось і ўвесь сакрэт даўгалецця, — казаў ветэран. — Ну хіба гены яшчэ: маці пражыла 102 гады».

...Самому ветэрану пакуль 100, і зроблена за гэты час вельмі шмат. Але ж узрост бярэ сваё. Іван Ігнатавіч жыве цяпер у Навагрудку ў доме кругласутачнага знаходжання для пажылых грамадзян і як быццам не маркоціцца: радуецца людзям і дзякуе богу за кожную новую раніцу, дагэтуль не прапускае магчымасці некага падтрымаць добрым словам, некаму расказаць штось цікавае і карыснае са свайго жыцця. А самае галоўнае — падае прыклад мужнасці і сілы духу, кажучы, што старасць — не падстава сумаваць, хіба... падсумоўваць.

Падчас акцыі МНС, май 2019 г., Настасся БЕРДЫГУЛАВА — першая злева.

Некалі, напрыклад, пра яго родную вёску Нянькава мала хто ведаў. Але ж Івану Ігнатавічу ўдалося, здавалася б, немагчымае: яе, так званую неперспектыўную, вярнуць да жыцця, зрабіць вядомай дзякуючы выдатнай выстаўцы фотаздымкаў, арганізаванай Нацыянальным гістарычным музеем да 100-гадовага юбілею іх аўтара.

Размовы з Іванам Ігнатавічам, яго жыццё і работы далі мне магчымасць зразумець, што не месца ўпрыгожвае чалавека, а чалавек месца. Нават самы, здавалася б, просты і сціплы!

Так, відаць, бывае, калі ён жыве не толькі для сябе, але і для іншых.

Настасся Бердыгулава, вучаніца 7 класа ДУА «Вераб'евіцкі дзіцячы сад — базавая школа»,
Навагрудскі раён.

Перажытае — не забытае

НА ДОБРЫ ЎСПАМІН

Памяць пра школьныя гады ў сэрцы кожнага і на ўсё жыццё. Мы памятаем сваіх аднакласнікаў і сваіх настаўнікаў, якія, нібы скульптары, ляпілі з нас асоб; памятаем першае каханне, выпускны...

Мне давялося вучыцца ў розных школах, але атэстат я атрымаў у Дакольскай сярэдняй.

Да 1908 года яна існавала як земская, потым — як чатырохкласнае вучылішча, як сямігодка. Дарэчы, у гэтай школе да вайны вучыўся мой бацька, яго настаўнікам быў Міхась Іосіфавіч Юрцэвіч, які потым вучыў мяне ў Карніцкай пачатковай школе і часта заходзіў у нашу хату. Ім — былому настаўніку і вучню — заўжды было пра што пагаварыць, аб чым параіцца...

Падчас маёй вучобы дырэктарам Дакольскай, ужо сярэдняй школы працаваў Баляслаў Валяр'янавіч Рынейскі — былы партызан, сакратар Глускага падпольнага райкама камсамола. У класах тады вучылася не менш чым па 30 вучняў, і прыходзілі яны з добрага дзясятка вёсак: з Сяльца, Старыны, Бярозак, Новаандрэеўкі, Веснава... Тады ж, у школе, я дакрануўся да подзвігу Сцяпана Антонавіча Калінкоўскага, які вучыўся ў ёй да вайны. Мне, дзевяцікласніку, як школьнаму мастаку даручылі афарміць стэнд, прысвечаны Вялікай Айчыннай вайне, і для нагляднасці дырэктар паказаў Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб прысваенні старшаму сяржанту Калінкоўскаму звання Героя Савецкага Саюза...

Іншымі словамі, школа наша была з гісторыяй, і мы, выпускнікі, вядома ж, помнім яе, у тым ліку — дзякуючы здымкам.

В. А. Васілеўскі,
г/п Глуск.

Чалавек — чалавеку

БЛАНДЗІН... ЁН ТАКІ АДЗІН

Не ўяўляю свайго жыцця без чароўных спеваў салаўя, без гудзення пчол, нават без шчымлівага «ку-ку». Пустым мне бачыцца любы падворак, дзе няма сабачай будкі і лаўкі для ката. А дачнікаў, якія, з'язджаючы ў цёплыя кватэры, на пагібель кідаюць сваіх гадаванцаў, і наогул зразумець не магу.

Аднаму з такіх гаротнікаў, праўда, пашчасціла: ён сустрэў на сваім шляху нашу ўнучку, і тая, прынёсшы ў хату малое згаладалае кацяня, так прасіла яго пакінуць, што мы не вытрымалі.

Так у нас з'явілася Дымка. І ўсё б з ёй добра, калі б...

У той добры дзень кошка, тоўстая, як гарбуз, уляглася на старым мяккім крэсле, побач — на маё здзіўленне — прыладкаваўся наш кот Пушок. Ён нават не падумаў адысці ад парадзіхі, а, наадварот, стаў... «прымаць» роды.

Так у нашай хаце з'явіўся «бландзін». Яго жыццё пачыналася як быццам шчасліва. А вось працягу магло і не быць.

Справа ў тым, што недзе праз тыдзень, калі кацяня толькі-толькі адкрыла вочкі, кошка раптам знікла (можа, загінула, можа, украў хто?), і ў малога (а следам і ў нас) пачаліся сапраўдныя пакуты: як абагрэць, чым пакарміць? А што, калі?..

З чайнай лыжачкі на кожнае «мяў» я стала ўліваць гэтай маляўцы па кропельцы свежага казінага малака. І ў нас атрымалася — каток глытаў.

Потым я навучыла яго самастойна хлябтаць малако і тады ўжо сказала: «Ну ўсё, мы будзем жыць».

Так яно і выйшла. Цяпер той Сіротка — усеагульны любімец. Ён акуратны, не назойлівы. Зімой, калі начуе на дварэ, цікуе, пакуль гаспадар выйдзе курыць на веранду, і тады, убачыўшы святло, лапкай стукае ў акно, каб адчыніў... Ну як тут не паслухаеш?! Нават тады, калі ён ноччу (і зноў жа лапкай) ціхенька пабудзіць — папросіць есці.

Вось такі ў нас разумны кот, да таго ж — прыгажун, якіх ні ў кога няма: з доўгай светлай поўсцю, з чарнявай, нібы трохі мурзатай пыскай, з вялікімі блакітнымі вачыма і шырокім, на ўсю спіну, хвастом. Ён лечыць мяне, калі нешта баліць, ён, здараецца, «рэгулюе» ціск, закалыхвае нанач, чакае з дарог... Ён упрыгожвае наша жыццё.

На нейкай паштоўцы аднойчы прачытала: «Без кота жизнь не та». І гэта — чыстая праўда.

Дык як жа данесці яе да ўсіх, хто цяпер вось жыве на лецішчах з гадаванцамі, а назад у свае кватэры хоча вяртаецца без іх?

Ніна Бурко,
Бярэзінскі раён

Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.